З першых вуснаў

# «ЗЫХОДЗІЦЬ БУДЗЕМ З ІНТАРЭСАЎ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА»

**Традыцыйна пасля галасавання на выбарчым участку № 1 Цэнтральнага раёна сталіцы кіраўнік дзяржавы адказаў на пытанні журналістаў. Магчымасць задаць пытанне — любое — была ў кожнага з амаль дзевяці дзясяткаў прадстаўнікоў беларускіх і замежных СМІ.**



Фота БелТА

## «Усё будзе нармальна»

Сітуацыя ў краіне пад кантролем, і беларусы на гэты конт могуць быць спакойныя, запэўніў Прэзідэнт. Ён паведаміў, што 170 чалавекам за ноч перад асноўным днём галасавання і раніцу гэтага дня было адмоўлена ў перасячэнні граніцы. Прычына — альбо фальшывыя візы, альбо адсутнасць выразнага тлумачэння мэты прыезду ў нашу краіну.

«Мы не расслабляемся, усе нашы адпаведныя структуры і спецслужбы пераведзеныя на ўзмоцнены рэжым нясення службы — не толькі міліцыя і не толькі пагранічнікі», — расказаў ён.

Каментуючы асаблівасці сёлетняй выбарчай кампаніі, Аляксандр Лукашэнка назваў яе самай складанай.

«Складанасць у тым, што мы, магчыма, шмат чаго не ведаем. Таму вымушаны працаваць па ўсіх франтах».

Ён дадаў, што дзяржаўны апарат прадугледжвае ўсякія варыянты, але падстаў казаць пра тое, што заўтра краіна будзе ўвагнаная ў хаос, абсалютна няма. На думку кіраўніка дзяржавы, галоўная рухаючая сіла спроб расхістаць сітуацыю ў краіне — грошы: «Я доўга думаў — ну што ж адбываецца. Вывад просты, як вы кажаце: «бабло». Грошы. Заплаціў — няважна, які пашпарт, якія ідэі, грошы ёсць — ваюем, змагаемся. Так і ў нас у краіне знутры адбываецца... Мы нічога тут не выключаем, але працуюць грошы. Таму, я думаю, заўтра ўжо яны адпрацуюць свае грошы, інвестыцыі гэтыя асвояць, супакояцца і зразумеюць, што жыццё ж адно». Тыя, хто сёння супрацьстаіць уладзе, застануцца жыць тут разам са сваімі апанентамі, заўважыў Прэзідэнт.

«Мы ўсе на гэтым кавалку сканцэнтраваны... мы ў адной лодцы. Будзем разгойдваць гэтую лодку, усе патонем разам. Таму ўсё будзе нармальна. Ідзе працэс. Працэс няпросты, але мы гатовыя да ўсяго», — запэўніў беларускі лідар.

## «Я гатовы весці дыялог»

«Калі вы проста выказваеце сваю пазіцыю або пазіцыю некага і там відаць, што гэта Пятроў, Сідараў, Іваноў, я гэта вітаю. Я гатовы з вамі весці дыялог, асабіста гатовы з вамі весці дыялог. Калі вы тэндэнцыйна пачынаеце паводзіць сябе, скажам так, я таксама гэта бачу — адпаведнае стаўленне. А калі вы правакуеце, ну дык атрымаеце тое самае ў адказ. Што не так? Вы што, хочаце спрабаваць звергнуць уладу, зламаць нешта, укалоць, абразіць, як гэта вы рабілі спачатку больш, зараз менш, і чакаеце, што перад вамі я або нехта ўкленчыцца і будзе вам цалаваць калені? Цалаваць пясок, па якім вы хадзілі? Не будзе гэтага!» — адрасаваў ён пасыл недзяржаўным СМІ.

Аляксандр Лукашэнка заклікаў да законнасці і выказаў упэўненасць, што шэраг медыярэсурсаў хацелі абвастрэння сітуацыі на вуліцах краіны.

«Пакуль мардабою не было, проста мы вас паставілі на месца, — заўважыў лідар. — Што вы хочаце ад нас? Хочаце, каб я ўкінуў у хаос краіну? Дык вы ж мяне потым стопчаце і будзеце мець рацыю, што я не абараніў, у тым ліку і вас, і вашу сям'ю. Я хачу, каб было спакойна, каб мы з вамі вялі дыялог, калі ён ёсць. І калі вы здольныя нешта зрабіць для краіны, паверце, я вам ствару ўсе ўмовы, каб вы працавалі на краіну».

## «Выконвайце закон»

Кіраўнік краіны адзначыў, што ў яго чатыры канкурэнты і Святлану Ціханоўскую ён не лічыць галоўным з іх, ніякіх рэпрэсій і парушэнняў закону да яе каманды не распачынаў і распачынаць не будзе.

«Выконвайце закон, і знікнуць усялякія размовы пра рэпрэсіі і яшчэ нешта. Будзеце парушаць — будзеце адказваць. І тое мы яшчэ мякка адказвалі, і шчыра я вам яшчэ скажу — я заўсёды стрымліваў праваахоўнікаў. Паўтарыць, што я ім сказаў? «Яны нічога не вартыя, каб супраць іх распачынаць нейкія рэпрэсіі. Нічога не вартыя з пункту гледжання палітыкі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Яго абурае праграма, якую прапанавалі канкурэнты, — адпусціць затрыманых і потым правесці выбары зноў.

«Вы Канстытуцыю чыталі? Я ўжо ў Пасланні гэтае пытанне закрануў. Ні я, ні кандыдат, які пераможа, калі не я, не назначае ў Беларусі прэзідэнцкія выбары. Парламент вам не дасць магчымасці ўвагнаць краіну ў перманентныя выбары. Вы разумееце, што вы прапаноўваеце народу?» — задаў рытарычнае пытанне Прэзідэнт.

На пытанне пра міжнародную ацэнку выбараў і пра імавернасць загадзя падрыхтаваных у заходніх партнёраў шаблонаў рэакцый Прэзідэнт адказаў коратка: «Калі шчыра, усё, што падрыхтавана, я ўжо прачытаў».

«Не чакайце, што перад намі расшаркаюцца і скажуць: малайцы, беларусы. Палітыка — гэта барацьба, а для нас — мастацтва магчымага. Мы не хочам, каб пра нас казалі блага, але зыходзіць будзем з інтарэсаў беларускага народа. Я хачу, каб у маёй краіне, у вашай, было ціха і спакойна, каб мы маглі гадаваць нармальна сваіх дзяцей, не азіраючыся па баках», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.

## «Дом з вокнамі на ўсход і на захад»

На пытанне польскага журналіста: «Куды паедзеце з візітам у выпадку перамогі на выбарах?» Аляксандр Лукашэнка адказаў: «Туды, куды запросяць. Я пакуль, шчыра вам скажу, асабліва не напружваюся з нагоды сваіх першых візітаў. Я ж не першы год буду Прэзідэнтам, калі мне людзі давераць. Таму ў мяне няма гэтай праблемы. Я ўжо з «першымі візітамі» наездзіўся. Таму шчыра вам скажу: гэтай праблемы ў мяне няма. Мы не будзем здзяйсняць візіт дзеля таго, каб нешта прадэманстраваць. Нам гэтага не трэба».

Курс знешняй палітыкі абазначаны ў Пасланні народу і парламенту, дадаў Прэзідэнт.

«Беларусь — гэта дом у цэнтры Еўропы з вокнамі на ўсход і на захад, з выхадам на поўдзень і на поўнач, — падкрэсліў ён. — Гасподзь так вызначыў, у сілу нашага месцазнаходжання мы вымушаныя, знаходзячыся ў геаграфічным цэнтры Еўропы, супрацоўнічаць з усімі. Мы будзем супрацоўнічаць. Я ўжо сказаў, што на ўсходзе ў нас вельмі моцныя дзве дзяржавы: хочам мы, не хочам, але з Расіяй заўсёды будзем супрацоўнічаць, заўсёды будзем разам у залежнасці ад таго, наколькі Расія здольная на больш цеснае альбо менш цеснае супрацоўніцтва. Бліскучыя адносіны з Кітайскай Народнай Рэспублікай, яны развіваюцца; з постсавецкімі краінамі, рэспублікамі ў нас вельмі добрыя адносіны. І з Польшчай у нас наладжваюцца адносіны. І калі вы там не будзеце праводзіць антыбеларускія акцыі, тыпу дэманстратыўнага давання прытулку розным дзеячам — ведаеце, пра што я кажу, — тады мы будзем выбудоўваць з вамі адносіны». Аляксандр Лукашэнка дадаў, што нафту і газ Беларусь будзе купляць там, дзе больш выгадна, пры гэтым яна працягне пазбаўляцца залежнасці ад адной краіны, таму працягне супрацоўнічаць, у тым ліку, і з Польшчай.

Што датычыцца затрыманых баевікоў, то беларускі бок запрасіў генеральных пракурораў Украіны і Расіі, каб разам абмеркаваць гэту сітуацыю, але пакуль ні адзін, ні другі не прыехалі.

«Не прыедуць — мы самі разбяромся і вырашым гэту праблему, — паведаміў Прэзідэнт. — Але запрашэнне пракурорам і адмова сюды прыехаць сведчаць пра тое, што напляваць ім на лёс гэтых хлопцаў... Мне ўсё роўна на цяперашні момант, хто іх сюды накіроўваў, гэта другаснае. Галоўнае, каб яны не ўчынілі тут пажар у цэнтры Мінска. Вось што для мяне сёння важна. Вядома, мы гэта будзем улічваць і будаваць свае адносіны (з іншымі краінамі. — **«Зв.»**) зыходзячы, у тым ліку, з гэтых момантаў».

Разам з тым пра перспектыву двухбаковых адносін Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Калі хтосьці чакае, што ў нас абсалютна сапсаваліся адносіны з Расіяй, памыляецеся. Мы з Прэзідэнтам Расіі прынялі рашэнне, і ніякія сродкі масавай інфармацыі, «вагнеры» і іншыя на гэта паўплываць не ў стане. Гэта квінтэсэнцыя, сутнасць нашых размоў з Прэзідэнтам Расіі».

## «Ёсць тэндэнцыі да таго, што мы выкараскаемся»

Асобна Аляксандр Лукашэнка спыніўся на наступствах пандэміі каранавіруса для беларускай эканомікі. У Беларусі намецілася хай невялікая, але дынаміка прыросту. Золатавалютныя рэзервы за гэты перыяд павялічыліся амаль да дзевяці мільярдаў.

«Гэта нечаканасць, у тым ліку і для мяне. Ёсць добрыя тэндэнцыі да таго, што мы выкараскаемся з гэтага крызісу», — сказаў ён.

Пацікавіліся журналісты і станам здароўя кіраўніка дзяржавы, які сам перахварэў на каранавірус. Як расказаў Аляксандр Лукашэнка, ён адчуваў сябе стомленым, але спісваў гэта на вялікія нагрузкі.

«Калі дамашнія мае прасігналізавалі, што ёсць праблемы, мы паехалі ў бальніцу і ўпэўніліся, што я перанёс той вірус на нагах, але хвастом усё ж такі мяне гэтая пандэмія ўдарыла. Калі б я не паехаў правярацца, можа, так і перанёс бы», — падзяліўся Прэзідэнт.

«А людзям сталейшым усё ж такі трэба берагчы сябе, таму што хвароба вылечная (нашы ўрачы малайцы, навучыліся) — але такая агідная, што далей няма куды... Хвароба вылечная, але вывады трэба зрабіць. Трэба прытрымлівацца здаровага ладу жыцця, правільнага харчавання. І ні ў якім разе не сядзець дома, быць больш на свежым паветры, варушыцца, бегаць, скакаць, займацца спортам», — параіў кіраўнік дзяржавы.

## Дзень выбараў і ўраджай

Прэзідэнт павіншаваў «Звязду» са 103-годдзем — 9 жніўня 1917 года выйшаў першы нумар нашай газеты. Наша карэспандэнт, задаючы пытанне кіраўніку краіны, нагадала пра гэта. «Я вас віншую. Дзякуй вялікі за інфармацыю», — сказаў ён, і ўсе прысутныя паапладзіравалі ў гонар нашага свята.

Першае пытанне «Звязды» да Прэзідэнта гучала так: «Як пройдзе ваш дзень у чаканні вынікаў галасавання?» Па яго словах, звычайна.

«Я нічога на цяперашні момант змяніць не магу, як вы разумееце. Усё залежыць ад людзей, якія прыйдуць на ўчасткі. Я ж не першыя выбары перажываю. Таму ў мяне ёсць пэўны вопыт. Я буду чакаць вынікі як і ўсе вы — проста чакаць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Адказваючы на другое пытанне нашага выдання, Прэзідэнт Беларусі выказаў упэўненасць, што беларусы годна збяруць сёлетні ўраджай. Па яго словах, убраць рэшту збожжавых за тры наступныя дні — не праблема. Дажджы, які пройдуць днямі на тэрыторыі Беларусі, ён назваў шчасцем, бо яны неабходныя культурам, якія застаюцца на палях.

«І кукуруза, і бульба, і капуста, і многае іншае на полі расце, і неабходны дождж. Гэта не страшна, людзі адпачнуць, пачысцяць камбайны і заўтра ці ўвечары выйдуць збіраць тыя ж збожжавыя. У мяне добры настрой», — паведаміў Прэзідэнт.

Ён заўважыў, што Гасподзь пашкадаваў нас, даўшы добры ўраджай.

## Такая розная моладзь

Прадстаўнікі маладзёжнага актыву, якія стаялі побач з журналістамі, выказалі словы падтрымкі Прэзідэнту. Кіраўнік дзяржавы папрасіў прадстаўнікоў недзяржаўных СМІ, якія задавалі правакацыйныя пытанні, звярнуць увагу на гэтае выказванне.

«Вы гэта пачулі? Ну, вы можаце сказаць, што яны там «прыкарытнікі», ды яны там побач з кармушкамі і гэтак далей. Але гэта самастойныя людзі, якія адбыліся, і што самае галоўнае — гэта таксама моладзь. Моладзь, як я казаў, таксама розная», — звярнуўся да прысутных Аляксандр Лукашэнка.

Задавалі апошнія пытанні журналісты пад моцным дажджом, але рашэнне працягнуць размову ў такіх умовах яны прынялі самі.

Журналіст амерыканскага інфармацыйнага агенцтва спытаў Прэзідэнта, ці ўпэўнены ён у сваёй перамозе і ці плануе і далей балатавацца на пасаду кіраўніка краіны.

«Калі буду жывы і здаровы, адкажу, ці збіраюся я балатавацца ў далейшым. А што датычыцца ўпэўненасці ў сваёй перамозе — я б не быў так адназначны. Я спадзяюся», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

**Марыя ДАДАЛКА, Варвара МАРОЗАВА, Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**